УДК 811.181.3’271

# АБЗАЦ ЯК МАРКЕР СТЫЛІСТЫЧНЫХ ФІГУР, ЗАСНАВАНЫХ НА ІНТАНАЦЫЙНАЙ ЭКСПРЭСІІ

*Шаршнёва Вольга Мікалаеўна*
дактарант кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі
ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны
ўніверсітэт імя Максіма Танка»;
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(г. Мінск, Рэспубліка Беларусь)

*У артыкуле абгрунтоўваецца сувязь прагматычнага патэнцыялу стылістычных фігур, заснаваных на інтанацыйнай экспрэсіі, з іх вылучэннем у абзац. Сярод заснаваных на інтанацыйнай экспрэсіі прагматычна маркіраваных стылістычных фігур разглядаецца рытарычнае пытанне, рытарычны вокліч і рытарычны зварот.*

Спецыфіка функцыянавання абзаца ў мастацкім празаічным тэксце дазваляе гаварыць аб прагматычным змесце структурных, сінтаксічных, стылістычных і графічных асаблівасцей абзацавання, якія хоць і цесна ўзаемазвязаны, але маюць свае адметныя напрамкі даследавання, звязаныя з асэнсаваннем абзаца як графічнага водступу. Пры гэтым сістэмны аналіз абзацнага афармлення дазваляе ўспрыняць візуальную рэпрэзентацыю семантычнай структуры мастацкага тэксту; асэнсаваць магчымасці разгортвання, члянення, актуалізацыі рознаўзроўневых моўных адзінак; заўважыць сродкі, спосабы і прыёмы, якія выкарыстоўвае пісьменнік для фіксацыі або руху мастацкіх сэнсаў.

Мастацкае абзацаванне заўсёды вобразнае, яно забяспечвае не толькі эмацыйнае ўспрыманне асобна вылучанай прагматычнай інфармацыі, але і яе імпліцытнае асэнсаванне. На думку Л. М. Кальцовай, мастацкі абзац «можна разглядаць як знак прад’яўлення, прадастаўлення эмацыйна-эстэтычнай інфармацыі ў выглядзе структурна значнага блока, як знак рэлевантнасці і сэнсавага адзінства аформленага абзацам кампанента (які б малы ці вялікі ён ні быў) у прасторы мастацкага тэксту, у яго цэласнай структуры» [2, с. 27]. Л. М. Кальцова падкрэслівае значнасць прагматычнага аспекту вывучэння абзаца, указваючы яго ўплыў на ўспрыняцце тэксту: «... абзац, арганізуючы моўны, слоўны матэрыял у блокі, выконвае надзвычай важную перцэптыўную функцыю, забяспечваючы ўпарадкаванне, дазваляючы рэгуляваць увагу, размяркоўваючы напружанасць і расслабленне ва ўспрыняцці» [2, с. 27].

Падыходы да вылучэння ў абзац розныя ў кожнага пісьменніка. Прынцыпы абзацавання могуць быць найбольш адметнымі паказчыкамі ступені падрабязнасці або абагульненасці пададзенага матэрыялу, суіснавання экспліцытнасці і імпліцытнасці, г. зн. паказчыкамі індывідуальнай творчай манеры. Абзацаванне тэксту, выклікаючы пастаянную інфармацыйную актыўнасць мастацкай структуры на ўсім працягу твора, з’яўляецца стылістычна значным і дапамагае зрабіць яго змест больш выразным.

А. І. Байчук сцвярджае, што ў мастацкім творы візуальны рытм увасабляецца ў архітэктоніцы тэксту, у прыватнасці ў афармленні абзацнага члянення, што дазваляе “ахарактарызаваць спосаб падачы матэрыялу пісьменнікам, а таксама ступень успрыняцця тэксту чытачом на ўзроўні візуальнай рэалізацыі матэрыялу” [1, с. 111].

З узмацненнем эмацыянальнага і эстэтычнага эфекту непасрэдна звязана прагматычная накіраванасць стылістычных фігур, заснаваных на інтанацыйнай экспрэсіі, – рытарычнага пытання, рытарычнага воклічу і рытарычнага звароту.

Зварот пісьменніка да чытача з **рытарычным пытаннем** – даволі эфектыўны прыём, які пераўтварае аўтарскі маналог у скрыты дыялог з аўдыторыяй, актывізуючы тым самым увагу чытача. Характэрнай рысай гэтага прыёму з’яўляецца ўмоўнасць ужывання адпаведнай граматычнай формы і пытальнай інтанацыі ў выпадках, якія не патрабуюць рэакцыі ў форме адказу. Абзацаванне рытарычнага пытання ўзмацняе яго прагматычны патэнцыял, падкрэсліваючы зварот да чытача, важнасць яго пазіцыі пры абмеркаванні ўзнятай праблемы:

*«Прости меня, Тришенька...», – просила ночью* [мать. – В. Ш.].

*Но разве можно простить предательство?*

*Он не просился на свет. Она его родила и потому не имеет права жаловаться на судьбу. Вместе с ни она должна принимать эту муку.*

*А вы думали – радость?*

*Христос – на муку, а вы – на удовольствие?*

*Все на муку, кроме глупцов и тиранов* (О. Ждан «Гений»);

*Відаць, думкамі ён* [Кулініч. – В. Ш.] *быў далёка адсюль, недзе там, на Дзікім Лузе, у тых часах, калі ён быў яшчэ ніякі не Скалазуб, а малады, дужы, радасны, удачлівы да таго, што нават рыбу мог злавіць, не замачыўшыся; калі ўсё было так светла, шчасліва, і верылася, што наперадзе будзе толькі лепш.*

*А можа, ён хацеў сказаць, што ж гэта за такая штука жыццё, як жа яно ўмее падманваць, то ўзносячы чалавека*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*высока, а затым непазбежна апускаючы ўсё ніжай, ніжай, ніжай?..* (А. Федарэнка «Дзікі Луг»);

*Каханне…*

*Хто з таемным першародным страхам і цнатлівым трымценнем голасу, з узбуджальна-хвалюючай дрыготкай у целе не прамаўляў, не вышэптваў і не выдыхаў гэтага слова, не вымольваў яго, не трызніў ім, не спадзяваўся на яго, як на апошнюю і найвышэйшую надзею?*

Хто не прагнуў гэтага пачуцця, як збавення і адрыўлення душы і духу, хто не маліўся мройлівымі начамі, каб нехта тамтой, на Вышынях, самы высокі і магутны, паслаў таго адзіна-адзінага, паразуменне і суіснаванне з кім робіць гэтае поснае жыццё асэнсаваным і радасным, дарує яго працяг?

*Хто не перажываў і не адчайваўся, не плакаў і не смяяўся, не радаваўся і не пакутаваў у чаканні яго, а яшчэ больш – з яго прыходам?*

*Хто не ўзлятаў на сёмае неба і не падаў у самыя злавесныя глыбіні апраметнай ад спробы яго спазнання?*

*Хто не нёс напаказ свой крыж радасці і не хаваў ад іншых крыж пакуты?*

*Хто не трапляў у чорны вір перажыванняў, выбрацца з якога часта было немагчыма* (А. Бутэвіч «Інстынкт, або прысак кахання і жарства пакут»).

Працытаваныя прыклады ілюструюць дарэчнае, кантэкстуальна выразнае абзацаванне рытарычнага пытання. Пісьменнікі не проста наладжваюць дыялог з рэцыпіентам – кожны абзацаваны кампанент успрымаецца як аргументацыя, выказаная чытачом і па-мастацку аформленая аўтарам. Абзацаванае рытарычнае пытанне актуалізуе ключавыя ідэі твора, робіць акцэнт на важных момантах, дапамагае зразумець матывы ўчынкаў таго ці іншага персанажа, узмацняе эмацыянальнае напружанне, падкрэслівае сур'ёзнасць сітуацыі або, наадварот, яе абсурднасць, сумненне або ўпэўненасць, рашучасць або безнадзейнасць.

Не меншым прагматычным патэнцыялам валодае абзацаваны **рытарычны вокліч**, закліканы на стварэнне экспрэсіўнага фону, на перадачу эксктамацыі выказвання:

*Колькі гадоў, дзесяцігоддзяў, стагоддзяў (хто здолеў бы падлічыць!) людзі намагаліся, стараліся, высільваліся, імкнуліся, хацелі, але не здолелі і да гэтага часу не могуць зразумець, спасцігнуць і разгадаць недасяжны сэнс гэтага звычайнага слова!*

*Колькі пакаленняў юных асобаў станавіліся мацяркамі, а то і мацяркамі-адзіночкамі, бацькамі, а то і непрызнанымі бацькамі, дзядулямі і бабулямі, так і не дапіўшы да донца салодка-горкую чашу гэтага неразгаданага і магічнага слова, не здолеўшы ўсвядоміць самі і не могучы растлумачыць саім дзецям і ўнукам яго зваблівы і няўлоўны змест!*

<…>

*і слова гэтае – К а х а н н е…* (А. Бутэвіч «Інстынкт, або прысак кахання і жарства пакут»).

З дапамогай вылучаных у абзац рытарычных воклічаў аўтар дэманструе момант найвышэйшага напружання ўласных эмоцый, сугучных з пачуццямі персанажа. Прычым варта заўважыць, што, размяшчаючыся ў самым пачатку твора, рытарычныя воклічы не толькі адлюстроўваюць настрой аўтара, але і ў значнай ступені фарміруюць драматычны настрой усяго твора. Паўторнае абзацаванне рытарычных воклічаў паказвае на адсутнасць адназначнай інтэрпрэтацыі акрэсленага пачуцця, а таксама дапамагае пісьменніку ўзняць і вынесці на абмеркаванне пытанні, якія не маюць канкрэтных адказаў, а таксама выклікаць роздум і пачуцці ў чытача. Абзацаванне рытарычнага воклічу звяртае ўвагу не толькі на важнасць выражаных на гэты момант думак, але і на неабходнасць стварэння атмасферы ўзаемаразумення паміж аўтарам і чытачом ужо з самых першых радкоў.

На ўзмацненні прагматычнай выразнасці маўлення пабудаваны **рытарычны зварот**, які не столькі называе адрасата маўлення, колькі надае маўленню пэўную інтанацыю, актуалізуючы аўтарскія інтэнцыі:

*Природа лишних – маргинальность, амбивалентность, их сила – в слабости. Хорошо бы смотреть футбол, отложив Пушкина, а за пивом обсуждать проюлемы бытия. Надо быть опарышем по форме, чтобы не истребить в себе одухотворяющее начало. Максимализм лишних становится, согласно диалектическим законам культуры, которую они так чтут, банальной глупостью. А глупость как свидетельство недомыслия унижает человека, превращая его в опарыша, питающегося чипсами идеологии.*

*Новый лишний, презирай и скучай весело! Носи свой крест улыбаясь. Если уж стремиться к высокому, то следует быть выше не только суеты опарышей, но и выше скуки, и даже презрения* (А. Андреев «Для кого восходит солнце?»).

Вылучэнне рытарычнага звароту ў абзац арыентавана на павышэнне эмацыянальнасці і прыцягненне ўвагі чытача да акрэсленай тэмы. Хто б ні быў аб'ектам звароту, аўтар у першую чаргу сканцэнтраваны на тым, каб наладзіць і падтрымаць кантакт з чытацкай аўдыторыяй, абуджаючы яе да пэўных роздумаў адносна сэнсу адметна пададзенай інфармацыі.

Можна сцвярджаць, што павышэнне прагматычнага патэнцыялу стылістычных фігур, заснаваных на інтанацыйнай экспрэсіі, непасрэдна звязана з іх вылучэннем у абзац. Менавіта абзацаванне ўплывае на ўзмацненне эмацыянальнасці, выразнасці, урачыстасці, характэрных для рытарычнага пытання, рытарычнага воклічу і рытарычнага звароту. Менавіта ад абзацавання залежыць сіла імпліцытнага ўздзеяння рытарычных фігур на рэцыпіента.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Бойчук, Е. И. Анализ ритма прозы (на материале французского языка) : монография / Е. И. Бойчук. – Ярославль : Канцлер, 2019. – 232 с.
2. Кольцова, Л. М. Абзац в структуре художественного текста / Л. М. Кольцова // Мир русского слова. – 2011. – № 3. – С. 22–29.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова